**УДК 94(476«1812»)**

# ВЫПРАБАВАННЕ ВАЙНОЙ. БЕЛАРУСКІ КРАЙ ПАДЧАС ФРАНЦУЗСКА-РУСКАГА СУПРАЦЬСТАЯННЯ 1812 г.

*Самовіч А. Л.*
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле прыводзіцца агляд некаторых значных ваенна-палітычных падзей, звязаных з супрацьстаяннем Расіі і Францыі на беларускай зямлі ў 1812 г. Разглядаецца становішча жыхароў часова акупаваных тэрыторый, а таксама стратэгіі выжывання мірнага насельніцтва ва ўмовах ваеннага часу. Надаецца ўвага панесеным у ходзе вайны стратам.*

***Ключавыя словы:*** *Беларусь; вайна 1812 г.; «Вялікая армія»; княства Літоўскае; Напалеон; Расія; Францыя.*

# TEST OF WAR. BELARUSIAN REGION DURING THE FRENCH-RUSSIAN CONFRONTATION OF 1812

*Samovich A. L.*
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The article provides an overview of some significant military and political events related to the confrontation between Russia and France on Belarusian soil in 1812. The situation of the inhabitants of the temporarily occupied territories is considered, as well as the survival strategies of the civilian population in wartime conditions. Attention is paid to the losses suffered during the war.*

***Keywords:*** *Belarus; «Grand Army»; war of 1812; Principality of Lithuania; Napoleon; Russia; France.*

У савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі перыяд французска-рускага супрацьстаяння 1812 г. называюць «Айчыннай вайной 1812 года», у Еўропе ён вядомы як «Рускі паход» ці «Другая польская кампанія Напалеона». Аднак, як бы не называўся дадзены ваенны канфлікт XIX ст., ён стаў значным па маштабах і разбуральным па наступствах сутыкненнем інтарэсаў дзвюх моцных імперый – Расіі і Францыі, якое ўцягнула ў сваю арбіту значную частку літоўска-беларускіх губерняў, што каштавала нашаму шматпакутнаму краю тысячы чалавечых жыццяў, мноства спаленых і разрабаваных гарадоў і паселішчаў.

**Мерапрыемствы акупацыйных уладаў.** Вайна паміж кааліцыяй еўрапейскіх дзяржаў на чале з напалеонаўскай Францыяй, з аднаго боку, і Расійскай імперыяй – з другога, пачалася 12 чэрвеня 1812 г. раптоўным уварваннем шматнацыянальных кантынгентаў «Вялікай арміі»

Напалеона праз памежную р. Нёман у заходнія межы Расіі. Паступовае прасоўванне ў глыб расійскай тэрыторыі прымушала імператара Францыі браць пад кантроль пакінутыя войскамі Аляксандра I беларускія гарады і вёскі.

Для кіравання занятымі мясцовасцямі і наладжвання працы тылу 19 чэрвеня 1812 г. Напалеонам было прынята рашэнне аб стварэнні Камісіі Часовага ўрада Літоўскага княства, якая падзялялася на некалькі камітэтаў (паліцыі, фінансаў, ваенны, унутраных спраў, народных спраў, харчавання і крам) [1]. Адначасова па французскім узоры арганізоўваліся і структуры мясцовага адміністрацыйнага кіравання: дэпартаменты, падпрэфектуры, кантоны [2].

Тэрытарыяльна княства Літоўскае ахоплівала чатыры дэпартаменты, створаныя на месцы былых Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губ. і Беластоцкай вобл. Сталіцай княства з’яўлялася Вільня. У кожным дэпартаменце засноўвалася адміністрацыйная камісія з трох чалавек, пры якой значыўся французскі інтэндант. Дэпартаменты дзяліліся на дыстрыкты (усяго 32), узначаленыя супрэфектамі. Дыстрыкты тэрытарыяльна супадалі з былымі паветамі. У Віленскім дэпартаменце ў перыяд французскай акупацыі 1812 г. мелася 11 дыстрыктаў, у Гродзенскім – 8, у Мінскім – 10, у Беластоцкім – 3. У кожным утвараліся павятовая камісія і падпрэфектуры, дзейнічалі павятовы суд і паліцыя, акруговыя камісары [3]. У гарадах засноўваліся муніцыпалітэты на чале з мэрамі. Пры муніцыпалітэтах арганізоўваліся суды. Мэр валодаў усёй паўнатой выканаўчай улады, члены муніцыпальнай рады мелі толькі дарадчы голас.

Вышэйшая ваенная ўлада ўваходзіла ў кампетэнцыю генерал-губернатара Літвы, якому былі падпарадкаваны ваенныя губернатары дэпартаментаў. Са жніўня 1812 г. у мэтах лепшай каардынацыі дзейнасці ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі ён жа з’яўляўся і кіраўніком Часовага ўрада. Агульны нагляд і кіраўніцтва ад імя Напалеона ажыццяўляў міністр замежных спраў Францыі, які знаходзіўся ў Вільні. На органы мясцовай улады ўскладалася задача забеспячэння напалеонаўскай арміі фуражом і харчаваннем.

Каб насыціць ахоўныя падраздзяленні і часткова папоўніць свае баявыя страты, Напалеон прыняў рашэнне аб стварэнні з ураджэнцаў краю літоўскіх войскаў. Колькасць сіл павінна была дасягнуць 17 тыс. чалавек. Загадам ад 1 ліпеня было абвешчана таксама аб наборы ў Вільні двух батальёнаў нацыянальнай гвардыі [4]. Асноўнае іх прызначэнне – забеспячэнне грамадскага парадку, ахова важных дзяржаўных і ваен-

ных аб’ектаў. Падобныя фарміраванні ствараліся і ў іншых гарадах Літоўскага княства. Служба ў нацыянальнай гвардыі з’яўлялася абавязковай для ўсіх гараджан мужчынскага полу ад 18 і да 50 гадоў, што валодалі нерухомасцю і яшчэ не ўступілі ў літоўскія рэгулярныя часці. Трэць гвардзейцаў атрымлівала абмундзіраванне і рыштунак за кошт горада, астатнія – за ўласныя сродкі, узбраенне паступала часткова з французскіх арсеналаў, часткова было трафейным.

Адначасова з заснаваннем нацыянальнай гвардыі Вільні ў кожным павеце стваралася па адной роце літоўскай жандармерыі колькасцю ў 30, 40 і больш чалавек. Афіцэрам заробку не прадугледжвалася, у адрозненне ад радавых, якія атрымлівалі па адным злотым: абмундзіроўвацца ўсе павінны былі за ўласны кошт. У гарадах, дзе раней дзейнічала магдэбургскае права, стваралася народная гвардыя ці міліцыя. Толькі ў адной Гродзенскай губ. было 856 жандараў. З леснікоў былі сфарміраваны шэсць батальёнаў стралкоў. Напрыклад, у згаданай Гродзенскай губ. апошніх налічвалася 140 чалавек.

У ліпені 1812 г. пачалося фарміраванне пяці пяхотных і чатырох кавалерыйскіх палкоў для выкарыстання ў якасці гарнізонных войскаў Вільні, Коўна, Мінска і Гродна [5]. Было прынята таксама рашэнне аб стварэнні 3-га гвардзейскага лёгкаконнага палка, які арганізацыйна павінен быў складацца з пяці эскадронаў (удалося сфарміраваць толькі чатыры). Яго камандзірам стаў ураджэнец Слонімшчыны брыгадны генерал Я. Канопка. Камісія Часовага ўрада прыняла пастанову аб наборы 1 тыс. добраахвотнікаў для гэтай воінскай часткі. У яе склад залічваліся шляхцічы ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў. Іх экіпіроўка ажыццяўлялася за ўласны кошт.

Камандзірамі літоўскіх палкоў прызначаліся прадстаўнікі мясцовай шляхты. Напалеон разлічваў кампенсаваць за іх кошт частку расходаў па стварэнні новых воінскіх фарміраванняў. Збольшага гэтыя разлікі апраўдаліся. Напрыклад, буйны памешчык І. Манюшка выказаў не толькі жаданне сфарміраваць, але і поўнасцю самастойна забяспечыць кавалерыйскі полк. Атрымаўшы дазвол Камісіі, ён неадкладна прыступіў да рэалізацыі сваёй задумы, апублікаваўшы на старонках «Літоўскага кур’ера» адпаведны зварот да суайчыннікаў. Новай вайсковай частцы было прысвоена найменне 21-га палка конных стральцоў, а камандзірам быў прызначаны сам Манюшка ў чыне палкоўніка.

На пачатковым этапе набор у літоўскія войскі ішоў хутка і без асаблівых цяжкасцей. Ужо ў канцы ліпеня колькасць іх асабовага складу перавышала 2 тыс. чалавек. У далейшым палкі былі ўкамплектаваны толькі на 50–60 % ад патрэбы. Паўнавартасныя часці нацыянальнай

гвардыі ўдалося стварыць ў Вільні і Гродна, жандармерыю – у Віленскім і Гродзенскім дэпартаментах (у Мінску ў яе запісаўся толькі 71 чалавек). Тым не менш да пачатку зімы агульная колькасць літоўскага войска разам з жандармерыяй склала не менш як 19 тыс. чалавек [6]. Аднак іх матэрыяльнае забеспячэнне было спалучана з вялікімі цяжкасцямі. Амаль усё неабходнае ўзбраенне, абмундзіраванне, рыштунак і коней прыйшлося завозіць з французскіх магазінаў на тэрыторыі герцагства Варшаўскага і Прусіі. У выніку літоўскія пяхотныя і конныя часткі мелі вялікі некамплект неабходнай зброі і ваеннай маёмасці. Баяздольнасць гэтых слабых фарміраванняў была нізкай, што неўзабаве і пацвердзілася падчас ваенных дзеянняў. Так, сфарміраваны брыгадным генералам Канопкам полк быў без асаблівых намаганняў разгромлены 7 кастрычніка ў г. Слоніме рускім рэйдавым атрадам.

Нельга абысці ўвагай і імкненне стварыць кавалерыйскую частку з ліку літоўскіх татараў, якія насялялі край. Набор мусульман-добраахвотнікаў ажыццяўляўся ў Навагрудскім, Мінскім, Ашмянскім, Лідскім і Ковенскім дыстрыктах. Намаганнямі ветэрана паўстання Тадэвуша Касцюшкі і польскіх легіёнаў Мустафы Мурзы Ахматовіча ўдалося ўкамплектаваць толькі адзін эскадрон, які ў пачатку кастрычніка далучылі да палка Я. Канопкі ў якасці атрада разведчыкаў. Іх няўдалае баявое хрышчэнне адбылося той жа восенню 1812 г. у «Слонімскай справе».

Трэба адзначыць, што, спрабуючы прыцягнуць на свой бок прадстаўнікоў мясцовай шляхты, Напалеон наўмысна выкарыстоўваў існуючыя супярэчнасці паміж Расійскай каронай і жыхарамі былых земляў Рэчы Паспалітай. Французскія і расійскія ўлады ажыццяўлялі пэўнае сацыяльна-палітычнае манеўраванне, выношвалі ідэю аднаўлення ў той ці іншай форме княства Літоўскага. Напярэдадні французска-рускага супрацьстаяння 1812 г. нямала ўраджэнцаў беларускіх земляў былі прыхільнікамі Расіі. Некаторая ж частка насельніцтва краю мела надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай і падтрымала французскі бок.

Далейшыя падзеі паказалі, што ўяўленні напалеонаўскай адміністрацыі аб гаспадарчых, сацыяльных, этнічных, моўных і рэлігійных асаблівасцях занятых тэрыторый, з якіх трэба было чэрпаць неабходныя для імператара Францыі людскія і матэрыяльныя рэсурсы, не адрозніваліся належнай глыбінёй. Гэтая акалічнасць не дазволіла пераадолець супярэчнасці паміж чаканнямі палітычна актыўнай мясцовай эліты ў стаўленні Напалеона і яго прагматычнымі мэтамі. Нягоды ваеннага часу прымусілі многіх з прыхільнікаў імператара Францыі развітацца з ілюзорнымі надзеямі на адраджэнне былой велічы Рэчы

Паспалітай і перагледзець свае ранейшыя погляды на місію «Напалеона-Вызваліцеля». У часткі шляхты і мяшчан, якія раней сімпатызавалі імператару Францыі, паступова стаў нарастаць «сіндром падманутых надзей». На паводзіны на мяжы панічных сярод жыхароў Віцебска паказваў у сваіх запісках французскі стаўленік маркіз Амедэ дэ Пастарэ. Паводле яго слоў, гараджане з прыходам салдат Напалеона «предавались смертельному страху и собирались кучей в некоторые дома, как будто этим увеличивалась их безопасность» [7]. Яркая карціна бедстваў, якія выпалі на долю мірных жыхароў у 1812 г., прыводзіцца і ў пазнейшым данясенні Копыскага павятовага прадвадзіцеля дваранства: «Оставшиеся помещики, захваченные шибким набегом французской армии, были подвержены с начала войны всем бедствиям, какое могло нанесть необузданное и своевольное, без всякой воинской дисциплины, управление как от регулярного войска, тем паче и от отлучившихся самовольно малых команд мародеров, всегда скитавшихся в пьяном положении. Грабительства, убийства были их упражнением» [8].

Павелічэнне мер адміністрацыйна-прававога ціску напалеонаўскай адміністрацыі на мясцовае насельніцтва, размах бясчынстваў падчас рэквізіцый фуражу і харчавання, а таксама іншыя праявы гвалту выклікалі ў адказ нелаяльныя настроі, у тым ліку і сярод заможных пластоў акупаванага краю. Ва ўмовах бясконцых пабораў гарадскія і сельскія жыхары пачалі звяртацца да розных індывідуальных і калектыўных стратэгій выжывання, такіх, напрыклад, як пакіданне свайго жылля і сыход на яшчэ незакранутыя вайной тэрыторыі, ухіленне ад непасільных харчовых і іншых паставак на патрэбы войскаў, ігнараванне заклікаў добраахвотна ўступаць у шэрагі нацыянальных вайсковых фарміраванняў і матэрыяльна іх падтрымліваць. Зацягванне ваенных дзеянняў, перабоі з матэрыяльным і харчовым забеспячэннем прыводзілі да ўсплёску дэзерцірства і марадзёрства ў шэрагах арміі ўварвання, цынічнага рабавання маёмасці беларускіх цэркваў і манастыроў, асабістых гаспадарак і падворкаў мірных грамадзян. Непажаданыя эксцэсы ва ўзаемаадносінах акупацыйных уладаў і мясцовага насельніцтва ўзнікалі ўсё часцей і часцей. Спробы, якія прадпрымалі маршалы Напалеона, каб спыніць маральнае разлажэнне сваіх войскаў, належных вынікаў не прыносілі.

Улічваючы складанае сацыяльна-палітычнае становішча падчас акупацыі напалеонаўскімі войскамі часткі беларускіх зямель, фельдмаршал М. І. Кутузаў, у'яўляючы сабой прыклад удумлівага дзяржаўнага дзеяча, на этапе праследу напалеонаўскіх войскаў прымаў шэраг важных крокаў, якія абаранялі мясцовае насельніцтва ад праяў рускай помсты

за асобныя факты супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі. У адным з падпісаных ім дакументаў прама гаварылася аб гэтым: «Вступая с армией в Белоруссию, в тот край, где при нашествии неприятеля некоторые из неблагонамеренных, пользуясь бывшими замешательствами, старались разными лживыми уверениями ввести в заблуждение мирных поселян и отклонить их от священных и присягой запечатленных обязанностей законному их государю, я нахожу нужным всем армиям, мною предводительствуемым, строжайше воспретить всякий дух мщения и даже нарекания в чем-либо жителям белорусским, тем паче причинение им обид и притеснений, а напротив, да встретят они в нас, яко соотчичи наши <…>, братьев, защитников от общего врага и утешителей во всем том, что они потерпели в кратковременную бытность под игом чуждой и насильственной власти, и с пришествием нашим да водворятся между ними тишина и спокойствие» [9].

Аляксандр I у якасці акта гуманізму выдаў 12 снежня 1812 г. адмысловы Маніфест, у якім аб'яўлялася «Всемилостивейшее общее и частное прощение» ўсім жыхарам былых польскіх тэрыторый, якія супрацоўнічалі з заваёўнікамі. Расійскі манарх публічна паабяцаў аддаць «все прошедшее вечному забвению и глубокому молчанию» [10]. Ім таксама была аб'яўлена амністыя для жыхароў заходніх губерняў, якія ўдзельнічалі ў вайне супраць Расіі, пры ўмове іх вяртання на радзіму на працягу двух месяцаў (пазней гэты тэрмін быў працягнуты) [11, арк. 167 адв.].

**Наступствы ваенных дзеянняў.** Уварванне напалеонаўскіх войскаў на беларускія землі закранула многія бакі штодзённасці мясцовага насельніцтва, яго значная частка пачала жыць па законах ваеннага часу. Гарадскія і сельскія жыхары, якія апынуліся на занятых ворагам тэрыторыях, вымушаны былі прыстасоўвацца да экстрэмальных умоў французска-расійскага супрацьстаяння, рэалізуючы ўласныя практыкі выжывання ў залежнасці ад уплыву тых ці іншых ваенных, палітычных і эканамічных фактараў. Многія беларускія паветы былі ахоплены голадам і эпідэміямі. Найбольш моцна пацярпелі мясцовасці, якія сталі арэнай кровапралітных бітваў. Амаль поўнасцю былі разбураны і знішчаны гарады Полацк, Відзы, Кобрын, Ваўкавыск.

З заканчэннем ваенных дзеянняў у краі адноўленая расійская губернская адміністрацыя паўсюдна прыступіла да першапачатковых падлікаў нанесеных вайной страт. Па адной толькі Мінскай губ. агульны памер урону склаў не менш за 34 186 976 руб. Кошт знішчанай (у тым ліку хлеба на палях і загінулай жывёлы), а таксама раскрадзенай (у тым ліку ад рознага роду рэквізіцый) маёмасці па Віленскай, Гродзенскай, Мінскай

губ. і Беластоцкай вобл. перавысіў 121 095 037 руб. 86 кап. асігнацыямі [12]. У Гродзенскай губ. падчас французскай акупацыі на трэць скарацілася пагалоўе жывёлы. У насельніцтва адбіраліся ўсё шэрае хатняе сукно, а таксама кажухі, якіх паступіла на склады ворага 1365 адзінак. Па афіцыйных дадзеных, матэрыяльны ўрон, прычынены французамі жыхарам гэтай губерні, склаў 32,5 млн руб. [13].

Асобныя факты гвалтоўнага адабрання запасаў харчавання і каштоўнай прыватнай маёмасці адзначаліся таксама сярод некаторых рускіх вайскоўцаў. Пры гэтым варта адзначыць, што такога роду злачынствы не насілі масавага характару, і ў выпадку выяўлення фактаў гвалту ў адносінах да мірнага насельніцтва вінаватыя падвяргаліся строгаму пакаранню, аж да вынясення смяротнага прысуду. Вядома некалькі распараджэнняў галоўнакамандуючага 2-й Заходняй арміяй П. І. Баграціёна, якія былі накіраваны на агароджу грамадзянскіх асоб ад крыўд і прыгнёту з боку войскаў. У адным з загадаў, аддадзеных падчас знаходжання генерала ў г. Кобрыне, адзначалася, «чтобы офицеры и нижние чины поступали с жителями снисходительно и старались привлечь их к себе дружелюбным обращением» [14, с. 152]. «Обязанность каждого чина охранять и защищать подданных своего государя, а отступающий от сего по законам должен быть расстрелян», – паведамлялася ў іншым загадзе палкаводца. «Первого, кто будет найден и обличен в каковом-либо насильственном поступке против жителей, – паказвалася далей у дакуменце, – будет расстрелян, а начальник роты, эскадрона или сотни разжалуется в рядовые» [14, с. 183].

На жаль, гісторыя французска-рускага ваеннага супрацьстаяння 1812 г. мае і сведчанні іншага кшталту. Шырокую агалоску, напрыклад, атрымала справа аб рабаванні скарбаў Нясвіжскага замка (дарагой мэблі, рэдкіх кніг, карцін, калекцыйных манет, прадметаў рэлігійнага культу), якая закранула імёны адмірала П. В. Чычагава, генерала С. А. Тучкова 2-га, камандзіра казачага палка І. І. Ісаева 2-га і інш. [15, арк. 2–2 адв.]. Пры гэтым трэба аддаць належнае вышэйшаму расійскаму кіраўніцтву, якое не пакідала без увагі і дбайных разбораў такога роду злоўжыванні. У прыватнасці, па «Нясвіжскім інцыдэнце» следства вялося аж да 1826 г. і ў некаторай ступені каштавала яго фігурантам вельмі паспяховай службовай кар’еры. Сам жа працэс аднаўлення пацярпелых ад французска-рускага ваеннага супрацьстаяння беларускіх гарадоў і мястэчак, а таксама спустошаных памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарак запатрабаваў немалых выдаткаў з боку расійскай дзяржавы і расцягнуўся на доўгія гады.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Кудряшов, И.* Призрак великой Литвы. Об одной малоизвестной странице войны / И. Кудряшов // Родина. – 1992. – № 6–7. – С. 33.

2. *Погодин, А. Л.* Наполеон и Литва / А. Л. Погодин // 1812–1912. Отечественная война и русское общество. – Москва, 1912. – Т. 3. – С. 168, 170.

3. *Швед, В.* Дыстрыкт / В. Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 327.

4. *К. М.* Литовское княжество / К. М. // Отечественная война 1812 года. Энциклопедия. – Москва: РОССПЭН, 2004. – С. 423.

5. *Попов, А. И.* Литовские войска / А. И. Попов // Отечественная война 1812 года: энциклопедия. – Москва: РОССПЭН, 2004. – С. 421.

6. *Кудряшов, И. Ю.* Вооруженные силы Литовского княжества 1812 года / И. Ю. Кудряшов // Старый барабанщик. – 1992. – № 1. – С. 25.

7. Записки маркиза Пасторэ о 1812 г. // Полоцко-Витебская старина / изд. Витебской учен. арх. комис. – Витебск, 1916. – Вып. 3. – С. 185.

8. Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – Т. 139: Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года: – Т. 3: Белоруссия в 1812 году / под ред. [и с предисл.] К. Военского. – Санкт-Петербург, 1912. – С. 36–37.

9. Листовки Отечественной войны 1812 года. Сборник документов. – Москва, 1962. – С. 76–77.

10. О прощении жителей от Польши присоединенных областей, участвовавших с французами в войне против России» 12 декабря 1812 г. // ПСЗРИ. – Санкт-Петербург, 1830. – Т. 1. – С. 481–482.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ). – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 12.

12. Беларусь и война 1812 года: Документы / сост. А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич; редкол.: В. И. Адамушко (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 2011. – С. 204.

13. *Беркоўскі, В.* Гродня ў 1812 годзе / В. Беркоўскі // Беларусь. – 1946. – № 4. – С. 57.

14. Русские полководцы; Документы и материалы. Генерал Багратион: Сборник документов и материалов / гл. арх. упр. НКВД СССР; под ред. С. Н. Голубова и Ф. Е. Кузнецова. – Москва: Госполитиздат, 1945. – 279 с.

15. НГАБ. – Ф. 296. Воп. 1. Спр. 2.